2 студзеня 2021 г. пасля цяжкай хваробы пайшоў з жыцця Васіль Емельянавіч Лявончыкаў, доктар педагагічных навук, прафесар, правадзейны член Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі пры ААН (г. Масква), член-карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі, былы дэкан і шматгадовы загадчык кафедраў, першы Прэзідэнт Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі.



**Васіль Емельянавіч ЛЯВОНЧЫКАЎ**

**27.05.1937–02.01.2021**

Васіль Емельянавіч нарадзіўся 27 мая 1937 г. у вёсцы Бярозаўка Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці. Яго педагагічная дзейнасць пачалася ў кастрычніку 1962 г. у Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А.М. Горкага. Ён першым у Беларусі абараніў кандыдацкую дысертацыю ў галіне бібліяграфазнаўства і стаў першым у Беларусі доктарам педагагічных навук па спецыяльнасці 05.25.03 «Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства».

Кола навуковых інтарэсаў В.Е. Лявончыкава было вельмі шырокае: тэарэтыка-метадалагічныя пытанні бібліяграфазнаўства і бібліятэказнаўства, гісторыя беларускай бібліяграфіі, бібліятэчная адукацыя, інфармацыйная культура, інфармацыйна-псіхалагічная бяспека бібліятэкі і інш. Вынікі яго навуковых даследаванняў былі адлюстраваны ў шматлікіх публікацыях, сярод якіх дзве манаграфіі, вучэбныя дапаможнікі, тэрміналагічныя і тлумачальныя слоўнікі.

Васіль Емельянавіч надаваў вялікую ўвагу падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў. Ён быў заснавальнікам і шматгадовым кіраўніком навукова-педагагічнай школы ў галіне бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства Беларусі, старшынёй і намеснікам старшыні спецыялізаваных саветаў па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Пад яго кіраўніцтвам былі абаронены шэсць кандыдацкіх дысертацый.

Значнае месца ў жыцці В.Е. Лявончыкава займалі грамадскія абавязкі. На розных гістарычных этапах ён быў членам савета ўніверсітэта і факультэта; галоўным рэдактарам навуковых зборнікаў, рэдкалегій часопісаў «Пытанні бібліяграфазнаўства і бібліятэказнаўства», «Бібліятэчны свет», «Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў» і інш.

За плённую працу В.Е. Лявончыкаў быў ушанаваны шматлікімі дзяржаўнымі ўзнагародамі: ордэнам «Знак Пашаны», медалямі «За доблесную працу», «Ветэран працы», нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі», Ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Васіль Емельянавіч карыстаўся вялікай павагай і любоўю калег, студэнтаў і бібліятэкараў краіны.

Светлую памяць аб В.Е. Лявончыкаве – вядомым ў свеце вучоным, адным з самых актыўных арганізатараў вышэйшай бібліятэчнай адукацыі краіны, адказным і патрабавальным да сябе і іншых чалавеку, настаўніку беларускай навукова-прафесійнай супольнасці мы захаваем у сваіх сэрцах!

Вечная памяць!

*Вера Касап, кандыдат педагагічных навук,*
*прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

*Мікалай Яцэвіч, кандыдат педагагічных, прафесар,*
*загадчык кафедры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ